УДК 821.161.3

**Д. П. Балакар**
*Установаадукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік*
*А. І. Белая*

## ДЗЕД ТАЛАШ ЯК СУБ'ЕКТ ГІСТОРЫІ І ПЕРСАНАЖ ЛІТАРАТУРЫ

**Уводзіны**. Васіль Ісакавіч Талаш, больш вядомы як дзед Талаш, — адна з самых вядомых фігур фальклору і гісторыі Беларусі, якая сімвалізуе барацьбу беларускага народа за незалежнасць і свабоду, удзельнік дзвюх войнаў. Палескі волат, на схіле гадоў здольны фізічна расправіцца адначасова з некалькімі ворагамі, дзед Талаш стаў героем народных паданняў і легенд, звязаных з перыядамі акупацыі і прыгнёту ў часы барацьбы з польскімі і нямецкімі акупантамі, а таксама гэтая легендарная асоба стала прататыпам твораў мастацтва, у прыватнасці аповесці Якуба Коласа «Дрыгва», напісанай у 1934 годзе.

Пра знакамітага дзеда, якога ў 1928 годзе за актыўны ўдзел у партызанскім руху ўзнагародзілі ордэнам Чырвонага Сцяга, даведаўся Я. Колас і напісаў пра яго аповесць, якая была выдадзена масавым тыражом у 1934 годзе. Прататыпам галоўнага героя паслужыў легендарны дзед. Якуб Колас апісвае эпізод, калі Талаш у адзіночку раскідаў траіх палякаў, якія затрымалі яго.

**Асноўная частка**. Па паходжанні Васіль Ісакавіч Талаш быў просты селянін, які з маленства шмат і цяжка працаваў на паноў. Прырода ўзнагародзіла яго незвычайнай сілай і кемлівасцю, упартасцю і нязломнай воляй. Пасля рэвалюцыі паляшук актыўна ўключаецца ў грамадскае жыццё, заклікае сялян галасаваць у Саветах за змены ў іх жыцці, сам працуе членам выбарчай камісіі.

Надзею на лепшае перакрэсліла акупацыя, здзекі і гвалт. Імкненне з усіх сіл абараняць сваё, роднае ўласціва многім ураджэнцам беларускага Палесся, у рэшце рэшт яно і прымусіла Васіля Ісакавіча ўзяцца за зброю: *«У дні польскай акупацыі адклаў убок свае звыклыя справы і узяўся за зброю палескі селянін Васіль Ісакавіч Талаш. У яго характары праявіліся найлепшыя нацыянальныя рысы нашага народа: духоўная і фізічная сіла, энергія, непакорнасць»* [1, с. 145]. Не толькі сеяць хлеб, будаваць, выхоўваць дзяцей умее беларускі народ, але і мужна абараняць сваю краіну. Сваю зямлю, сваю чалавечую годнасць. Сваё права «людзьмі звацца» [1, с. 143]. Упершыню гэта адбылося яшчэ восенню 1919-га, у грамадзянскую вайну, калі ў яго родныя Навасёлкі прыйшлі белапалякі: *«Восенню 1919 года Петрыкаў тройчы перахзодіў з рук у рукі»* [1, с. 143]. Пачаўся змрочны перыяд польскай акупацыі, які працягваўся да ліпеня 1920 года.

Тады ў адпаведнасці з загадам Юзафа Пілсудскага пашырыць польскую флатылію вораг меў намер спыніцца на рацэ Прыпяці, у раёне гарадоў Петрыкаў, Мазыр і Тураў. Палякі не толькі вырашалі свае стратэгічныя воінскія задачы, але і паводзілі сябе як захопнікі - нахабна і бязлітасна ў адносінах да людзей, мірнага насельніцтва: *«Да нас з'явіліся не людзі, а банда нейкіх драпежнікаў і грабежнікаў…грабілі, здзекваліся, асабліва з беднага насельніцтва. І селянін пачаў шукаць выйсце»* [1, с. 144]. У Васіля Ісакавіча, наведваўшыся да таго ў хату, яны, напрыклад, забралі усё сена. Спачатку дзед па-добраму спрабаваў іх супакоіць, але потым выхапіў з-за пояса сякеру. Як піша Заір Азгур, ё*н заўсёды «"лез" у бойку. У спрэчку. Умешваўся ў сварку, барацьбу, гвалт. Не мог стрымацца, калі бачыў, што справядлівасці трэба дапамагчы, што чалавечую годнасць трэба ратаваць»* [1, с. 135].

Тым самым выбар быў зроблены: надышоў час ратаваць не толькі сваё дабро, але і свой гонар і годнасць.Арганізаваўшы ў сваe 75 гадоў партызанскі атрад з ліку мясцовых жыхароў з дапамогай чырвонаармейцаў, Талаш сам яго і ўзначаліў: *«Наўперад у наш атрад набралася 12 чалавек. У кароткі час ён разросся да 300 чалавек. У атрад ішлі бедныя, пападалі ў яго асобныя чырвонаармейцы, якія гублялі свае часці»* [1, с. 145]. Было вырашана зрабіць ноччу налёт на вёску Навасёлкі. Пра гэта наступленне Якуб Колас у аповесці «Дрыгва» піша так: *«Падрыхтавалі пазіцыю, размеркавалі на ёй байцоў, заняўшы два бакі дарогі і пераняўшы яе трохі далей, у лесе, і сталі падпільноўваць палякаў. Букрэй і атаман дзед Талаш абыходзілі пазіцыю, правяралі начальнікаў звенняў і кожнага байца, зварачаючы ўвагу на вытрыманасць, спакой і строгае выкананне каманды»* [цыт. па: 1, с. 145]. Баявая задача заключалася ў тым, каб ніводзін польскі салдат не быў выпушчаны. Гэтае наступленне было першым поспехам. Яно паклала пачатак арганізацыі шырокага партызанскага руху на Гомельшчыне. Былы камандзір дзед Талаш стаў разведчыкам 417-га пяхотнага палка Чырвонай Арміі. Вопытны партызан добра ведаў левабярэжжа Прыпяці, размяшчэнне населеных пунктаў: *«Адпусціўшы бараду, прыняўшы аблічча жабрака, ён смела хадзіў сярод варожых салдат, прыслухоўваўся да іх размоў, выведваў іх пазіцыі, узбраенне»* [1, с. 147].

Апрача непасрэднага ўдзелу ў баявых аперацыях, дзед Талаш выконваў важныя даручэнні камандавання Чырвонай Арміі па распаўсюджванні падпольнай літаратуры за лініяй фронту і сярод польскіх салдат.

Калі край пачаў залечваць раны, аднаўляць жыццё, савецкае камандванне вызваліла дзеда Талаша ад далейшай ваеннай службы: у 1920 годзе яму споўнілася 76 гадоў, і быў ён у радах Чырвонай Арміі толькі па сваім добраахвотным прызванні. Тады атрад уліўся ў адну з частак Чырвонай Арміі і дзед Талаш не мог служыць па стану здароўя (перанёс тыф) і вярнуўся ў родную вёску. Васіль Ісакавіч і ў дні мірнага жыцця

Рэпазіторый БарДУ

змагаўся з ворагамі і шпіёнамі, засланымі ў нашу краіну з-за мяжы. Пра гэта прыгадвае зямляк героя Н. Д. Зарыцкі, абапіраючыся на ўспаміны самога дзеда Талаша.

Аднак нядоўгім быў мірны час. На нашу краіну напалі нямецка-фашысцкія захопнікі. Абставіны патрабавалі згуртавання ўсіх сіл для барацьбы з ворагам. Дзед Талаш выступаў перад землякамі, заклікаў іх да абароны Радзімы.

Зімой 1943-га партызанскім камандаваннем Васіль Ісакавіч быў камандзіраваны ў Маскву, у штаб партызанскага руху, які ўзначальваў Панцеляймон Панамарэнка. Дарэчы, там ён упершыню сустрэўся з Якубам Коласам. Пісьменнік, даведаўшыся аб прыездзе легендарнага партызана, сарваўся з Ташкента, дзе знаходзіўся ў эвакуацыі. У Маскве Васіль Талаш наведваў фабрыкі, заводы, дзяржаўныя ўстановы, ваенныя часці, сустракаўся з людзьмі розных прафесій, расказваў ім пра баявыя подзвігі беларускіх партызан. Выступаў перад ваярамі, якія адпраўляліся на фронт. У Маскве Васіль Ісаакові́ч праводзіў актыўную дзейнасць па забеспячэнні беларускіх партызан адзеннем, боепрыпасамі і прадуктамі.

Палескі селянін двойчы прыязджаў у Мінск на сустрэчу з Якубам Коласам. Дзед Талаш уважліва чытаў і перачытваў твор. Сярод герояў ён даведваўся таварышаў па зброі, нягледзячы на тое, што прозвішчы былі зменены [2].

Не абмінула ўвагай вядомага партызана і газета-плакат «Раздавім фашысцкую гадзіну». У № 97 за 1943 год яе супрацоўнікі змяшчаюць малюнак-партрэт героя. Мастак І. Ахрэмчык паказаў дзеда ўдумлівым, засяроджаным. Мужны твар патрыёта свеціцца рашучасцю і смеласцю. Пад партрэтам быў змешчаны верш вядомага рускага паэта А. Суркова *«Дзед Талаш»*, напісаны яшчэ ў пачатку вайны: *«Тлеюць зоры над палямі / Пакідаюць зорны след / З партызанамі-сынамі / У засадзе мужны дзед / Дзед Талаш не горбіць спіну / Промні свецяцца з-пад броў / У бой за родную краіну / Кліча дзед сваіх сыноў»* [цыт. па: 1, с. 194].

**Заключэнне.** Такім чынам, дзед Талаш — гэта актыўны ўдзельнік гістарычных падзей, суб'ект гісторыі. Але яго вобраз выступае таксама і як важны культурны сімвал, з'яўляецца часткай беларускага фальклору, захаваўся ў вусных аповедах і песнях, адлюстраваны ў творах мастацкай літаратуры. Васіль Ісакавіч Талаш служыць прыкладам для пакаленняў, уяўляючы сабой ідэал мужнасці, мудрасці, рашучасці, увасабляе моц духу беларускага народа, сувязь паміж мінулым і сучаснасцю. Яго постаць не губляе значнасці як крыніца натхнення для беларусаў у іх змаганні за свабоду айчыны і чалавечую годнасць.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Жыгоцкі, М.* Якуб Колас і легендарны дзед Талаш : нарысы / М. Жыгоцкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2012. — С. 135—180.
2. Дзед Талаш і Дзед Васіль // Нацыянальная бібліятэка Беларусі. — URL: https://www.nlb.by/by/ (дата звароту: 04.10.2024).

УДК 811.161.3

**А. С. Бобель**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік*
*І. С. Чуносава*

## ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ КАМПЕТЭНЦЫЯ: СТРУКТУРА І ЗМЕСТ

**Уводзіны.** У эпоху глабалізацыі і інтэнсіўных міжкультурных кантактаў важнасць лінгвакультуралогіі не можа быць пераацэнена. Авалоданне ведамі лінгвакультуралагічнага характару можна лічыць важным складнікам станаўлення адукаванага чалавека, а таксама абавязковым элементам у працэсе выхавання культуры паводзін і навучання мове. «Лінгвакультуралогія, — як адзначае В. А. Маслава, — гэта галіна лінгвістыкі, якая ўзнікла на стыку лінгвістыкі і культуралогіі і даследуе праявы культуры народа, якія адлюстраваліся і замацаваліся ў мове» [1, с. 6].

Акцэнтуем увагу на адным з базавых паняццяў гэтай навукі — лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі — якая разглядаецца ў кантэксце «валодання мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры, як сродкам спасціжэння айчыннай і сусветнай культуры; здольнасць карыстацца культуразнаўчымі звесткамі ў працэсе маўленчых зносін» [2]. Лінгвакультуралагічная кампетэнцыя праяўляецца ў цікавасці да роднай мовы і элементарным эмацыянальна-каштоўнасным стаўленні да яе, спрыяе першапачатковай нацыянальнай самасвядомасці [3, с. 5].

**Асноўная частка.** Паняцце «лінгвакультуралагічная кампетэнцыя» знаходзіць сваё адлюстраванне і ў лінгвадыдактыцы. У вучэбных праграмах па беларускай мове адзначаецца, што «лінгвакультуралагічная кампетэнцыя — усведамленне вучнямі мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні,



Рэпазіторый БарДУ